Варшаўскі, Д. Юрый Багушэвіч / Д. Варшаўскі // Аршанская газета. – 2023. – 7 кастр. – С. 8.

## ЮРЫЙ БАГУШЭВІЧ

**Юрый Багушэвіч (Георгій Канстанцінавіч) нарадзіўся 5 мая 1917 у Оршы, памёр 18 мая 1983 у Мінску. Беларускі пісьменнік і перакладчык.**



Нарадзіўся ў сям'і чыгуначніка. Скончыў факультэт мовы і літаратуры Мінскага педагагічнага інстытута (1941), адначасова працаваў у газеце «Сталнноская молодежь». У часы Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў дзеючай арміі на Калінінскім і Беларускім франтах. З 1943 года служыў ваенным карэспандэнтам дывізійнай газеты «Кутузавец» 1-й стралковай дывізіі 96-га стралковага корпуса 70-й арміі. З 1945 – у ваеннай газеце на Далёкім Усходзе (Карэя, Кітай). Пасля дэмабілізацыі (1949) працаваў у рэдакцыях газет «Піянер Беларусі», «Мінская праўда», «Фізкультурнік Беларусі», быў карэспандэнтам газеты «Советский спорт», літкансультантам СП БССР, галоўным рэдактарам Мінскай кінастудыі навукова-папулярных і дакументальных фільмаў. Сябра СП СССР (1954).

Дэбютаваў у 1938 годзе. Пісаў пераважна на рускай мове. Выйшлі аповесці «Побратимы» (1955), «Дерево дружбы» (1959), «Повестм \л расска-зы» (1970), «В городке над Неманом» (1973), «Ды-рэктар «зялёнай шко-лы» (1975), «Юность пришла» (1977, 1987). Прымаў удзел у напісанні гісторыі мінскіх станкабудаўнічага і аўтамабільнага заводаў. Напісаў некалькі сцэнарыяў кароткаметражных кінафільмаў, у сааўтарстве з В. Зубам – п'есу «Сябры» (1960). Пераклаў на рускую мову асобныя творы П. Пестрака, А. Рылько, П. Кавалёва, аповесць Р. Няхая «Сарочы лес», зборнік «Піянеры-героі» (з Б. Бур'янам).

Усе творы Юрыя Канстанцінавіча вельмі рэалістычныя, напоўненыя жыццёвай праўдай. Пагэтаму некаторыя з іх, такія, як «Побратимы» і «Юность пришла», перавыдаваліся шмат разоў.

Узнагароджаны ордэнам «Айчыннай вайны» II ступені, ордэнам «Чырвонай Зоркі», медалямі «За вызваленне Варшавы», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 г.».

Памёр літаратар 18 мая 1983 года ў Мінску. Пахаваны на Паўночных могілках.

**Д. ВАРШАЎСКІ**